Падтрымай "Вясну" на PATREON

Палітвязня асудзілі да 1,5 гадоў калоніі за ўдзел у некалькіх маршах

31.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, палітвязні, свабода мірных сходаў



Судовая зала. Ілюстрацыйнае фота spring96.org

29 кастрычніка ў судзе Заводскага раёна паводле арт.342 Крымінальнага кодэкса асудзілі 32-гадовага палітвязня Аляксея Зікеева. Суддзя Касцюкевіч прызнала яго вінаватым у актыўным удзеле ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікам улады, якія прывялі да парушэння працы транспарту. Яна прызначыла пакаранне тэрмінам 1,5 гады пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Пад вартай Аляксей знаходзіцца з 17 чэрвеня 2021 года.

Пазоў Мінсктранса ў памеры 41 тысяча 900 рублёў 44 капейкі вылучаны ў грамадзянскую вытворчасць.

Аляксей Зікееў — мінчанін, жанаты, мае 6-гадовага сына. У яго вышэйшая адукацыя, да затрымання працаваў дырэктарам. Таксама ён былы старэйшы следчы, а падчас выбарчай кампаніі 2020 года быў у камандзе Валерыя Цапкалы.

У чым прызналі вінаватым?

Аляксея прызналі вінаватым, што ён удзельнічаў у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах у Мінску 16, 23, 30 жніўня 2020 года, а таксама 6 верасня 2020 года. Згодна з абвінавачаннем, ён парушаў парадак, далучыўся да групы грамадзян, пляскаў у ладкі, выкрыкваў лозунгі, перашкаджаў руху транспарту.

Што казалі сведкі?

Падчас паседжання ў якасці сведак выступілі супрацоўнік фірмы, у якой працуе Аляксей. Сведка Маркевіч В. распавёў, што ведае мужчыну 8 гадоў, яны разам працавалі ў СК Маскоўскага раёна. Яны не хадзілі на масавыя мерапрыемствы разам, толькі аднойчы сустрэліся ля Палаца Незалежнасці і сфатаграфаваліся на Маршы супраць гвалту. Ён распавёў, што яны знаходзілія на зялёнай зоне, людзі былі мірныя, ніхто не кідаў камянёў. Таксама ён сказаў, што Аляксей пасля выбараў 2020 года Аляксей крытычна ставіўся на дзеянняў улады, але без радыкалізму. Першапрычынай для гэтага стаў гвалт супрацоўнікаў.

Сведкай на судзе выступіла таксама жонка Алена. Яна распавяла, што Аляксей выдатны чалавек. Ён вельмі добры, клапоціцца пра сына, дапамагае людзям. Таксама ён з'яўляецца донарам. Таксама яна сказала, што ён мае шмат грамат, рэкамендацыйныя лісты з месца службы. Па яе словах, Аляксей уважлівы, знаходзіць агульную мову з людзьмі, займаецца спортам, надае вялікую ўвагу выхаванню сына.

Што было ў спрэчках?

У спрэчках пракурор сказаў, што віна Аляксея цалкам даказаная. Ён запрасіў для яго 1,5 гады калоніі, з чым у выніку пагадзіўся суддзя. Абаронца адзначыў, што няма ніводнага доказу парушэння групавых дзеянняў грамадска-палітычнага характару, акрамя чатырох сэлфі з тэлефона.

> У апошнім слове Зікееў прамовіў: *"За той час, што я знаходзіўся ў СІЗА, я прыйшоў да высновы, што няма нічога даражэй сям'і — ніякія грошы, нічога.У мяне ёсць адна просьба: не пазбаўляць мяне свабоды, каб я змог вярнуцца да сваёй сям'і, выхоўваць дзіця,* ***і мне не давялося б тлумачыць яму, чаму яго тата адсутнічаў дома****. І проста працягваць далей быць грамадзянінам сваёй краіны, я нічога нікому дрэннага не зрабіў, я заўсёды аказваў дапамогу".*

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY